85.514
Г765

Дб

Беларускі універсітэт культуры

УДК 784. 4(476): 37

ГРАМОВІЧ Ірына Міхайлаўна

# ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ НАВУЧАННЯ НАРОДНАЙ МАНЕРЫ СПЕВАЎ З УЛІКАМ РЭГІЯНАЛЬНЫХ ПЕСЕННЫХ ТРАДЫЦЫЙ БЕЛАРУСІ

13.00.05 - тэорыя, методыка і арганізацыя культурна-асветніцкай дзейнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А ў т а р э ф е р а т

дысертацыі на суісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук

Мінск 1998

Работа выканана на кафедры тэорыі музыкі Беларускага універсітэта культуры

Навуковы кіраўнік — кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт Смагін А.І.

Афіцыйныя апаненты — доктар педагагічных навук, прафесар Казімірская І.І.

кандыдат педагагічных навук, дацэнт Рэўтовіч Я.М.

Апаніруючая арганізацыя — Нацыянальны інстытут адукацыі

Абарона адбудзецца "___" ____________ 1998 г. у ___ гадзін на пасяджэнні савета К 09.03.01 па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук у Беларускім універсітэце культуры па адрасу:

220001, г.Мінск, вул. Рабкораўская, 17.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага універсітэта культуры

Аўтарэферат размножаны "____" ______________ 1998 г.

Вучоны сакратар савета
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт Л.І.Казлоўская



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Актуальнасць тэмы даследавання.** Перыяд сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у нашай краіне і новыя адносіны да фальклору вызначылі агульную накіраванасць, характар і змест педагагічнай дзейнасці на шляху захавання народнапесенных традыцый. Сучасны этап адраджэння нацыянальнага мастацтва характарызуецца вяртаннем да агульначалавечых каштоўнасцей і ідэалаў, якія назапашваліся стагоддзямі.

Адаптацыя фальклору ў сучасных абставінах — вельмі складаны працэс, вывучаны не ў поўнай меры, і выклікае шмат спрэчак. Несумненна тое, што фальклярыстыка не павінна абмяжоўвацца вывучэннем толькі традыцыйных формаў бытавання народнапесенных традыцый, а звяртаць увагу на прынцыпы трансфармацыі яго ў сучасных умовах. Імкненне захаваць нацыянальныя традыцыі падводзіць да пытанняў, як патрэбна іх захоўваць і хто павінен іх захоўваць.

Неабходнасць адказу на гэтыя пытанні вымушае нас звярнуцца да вывучэння педагагічнага патэнцыялу фальклору. Асноўнымі захавальнікамі народнай традыцыі з'яўляюцца аматарскія гурты, якія характарызуюцца спецыфічнай метадыкай яе інтэрпрэтацыі. А гэта патрабуе выяўлення сродкаў і магчымасцей, якія могуць быць накіраваны на дасягненне мэт навучання народнай манеры спеваў у аматарскім фальклорным руху. Акрамя гэтага, вельмі важнае значэнне маюць распрацоўка і асэнсаванне пытанняў спецыфікі мастацка-педагагічнай дзейнасці ў аматарскіх гуртах і падрыхтоўка кіраўнікоў фальклорных гуртоў, народных хароў і выканаўцаў беларускай народнай песні.

Увасабленне традыцыйных нормаў выканання ўзораў народнапесеннага мастацтва на сучасным этапе неразрыўна звязана з пастаянным вывучэннем рэгіянальных асаблівасцей выканання беларускай народнай песні. Аднак простая рэстаўрацыя аўтэнтычных народных твораў не можа вырашыць праблему навучання народнай манеры з захаваннем рэгіянальных песенных традыцый.

Сярод сучасных даследаванняў праблем захавання народнапесенных традыцый яшчэ мала такіх прац, якія б спецыяльна былі прысвечаны канцэпцыі выканання беларускай народнай песні, авалодванню навыкамі гуртавых спеваў, пошуку найбольш эфектыўных, з улікам рэгіянальных асаблівасцей метадаў навучання.

У спецыяльнай сучаснай літаратуры пакуль яшчэ толькі абазначаюцца імкненні аналізаваць агульныя прынцыпы тэхналогіі выканання народнай песні, а таксама педагагічныя прынцыпы падрыхтоўкі кіраўнікоў народных хароў і фальклорных гуртоў. Назапашаны тэарэтычны багаж можа служыць базай для авалодвання народнай

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага універсітэта культуры
Інв. N 8/н

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

манерай спеваў як у навучальных установах, так і ва ўмовах аматарскіх гуртоў.

Тэарэтычныя даследаванні аб рэгіянальных асаблівасцях песеннага фальклору, умовах яго існавання, жанравай разнастайнасці разгледжаны ў працах Л.С.Мухарынскай, З.Я.Мажэйка, З.В.Эвальд, М.Я.Грынблат, М.В.Доўнар-Запольскага, В.І.Ялатава, К.В.Квіткі, А.І.Гурскага, Г.І.Цітовіча, П.В.Шэйна, Е.В.Гіпіуса, Р.І.Яраслаўцава, Т.С.Якіменкі, Я.В.Яфрэмава і інш.

Важнымі для нашага даследавання з'явіліся працы, у якіх разглядаюцца функцыі мастацтва як мастацка-педагагічнай з'явы (І.І.Зямцоўскі, В.В.Конан, С.О.Грузенберг). Разам з тым вялікае значэнне для нас мелі працы па поліфункцыянальнасці фальклору (В.Е.Гусеў, А.М.Аляхновіч, А.С.Кабанаў, В.В.Конан, І.В.Несцьеў, А.М.Рахматуліна, А.А.Якімоўскі).

Пры выяўленні спецыфікі выхаваўчых магчымасцей аматарскага мастацтва ў захаванні народнапесенных традыцый улічваліся палажэнні, выказаныя І.І.Зямцоўскім, А.С.Кабанавым, В.М.Шчуравым. Асноўныя прынцыпы выхаваўчай дзейнасці ў аматарскіх калектывах сфармуляваны ў даследаваннях А.С.Каргіна, О.М.Мяціевай, Л.П.Стулавай, Н.В.Калугінай, В.П.Савельевай, Л.В.Шамінай, У.І.Сітнікава, А.М.Рахматулінай.

Вырашэнню задач даследавання па выяўленні асноўных прынцыпаў навучання народнай манеры спеваў і метадычных прыёмаў садзейнічаў аналіз літаратуры па вакальнай педагогіцы наступных аўтараў: Н.К.Мяшко, А.Б.Рудневай, Л.Л.Хрысціянсана, А.Г.Менабені, Д.Я.Агароднава, Л.Б.Дзмітрыева, О.А.Апраксіна, Н.М.Малышавай, Я.Б.Арцёменкі. Выяўленню дыялектных асаблівасцей беларускіх гаворак дапамаглі працы А.А.Крывіцкага, Л.Ф.Шаталавай, В.У.Емяльянава.

Пошук сапраўдных арыенціраў педагагічнай дзейнасці, прызнанне прыярытэтных каштоўнасцей робяць актуальным зварот да песеннага фальклору як да аднаго з такіх арыенціраў, які дазваляе захаваць векавыя традыцыі. У сувязі з гэтым распрацоўка праблемы педагагічнай арыентацыі, выяўленне фактараў, якія ўплываюць на народную манеру спеваў на Беларусі, стварэнне спецыяльных метадычных праграм і абгрунтаваных рэкамендацый па захаванню народнапесенных традыцый розных рэгіёнаў Беларусі набываюць асаблівую **актуальнасць.** Недастатковая тэарэтычная распрацаванасць праблемы навучання народнай манеры спеваў, яе практычная важнасць далі магчымасць вызначыць тэму даследавання: "Педагагічныя аспекты навучання народнай манеры спеваў з улікам рэгіянальных песенных традыцый Беларусі".

**Сувязь даследавання з буйнымі навуковымі праграмамі.** Даследаванне адлюстроўвае прынцыпы, ідэі і палажэнні агульнай навуковай тэмы кафедры беларускай народнай песеннай творчасці Беларускага



універсітэта культуры па ўдасканаленню навучальнага працэсу, а таксама Канцэпцыі адукацыі і выхавання ў Беларусі (1993 г.).

**Мэта даследавання** — раскрыць асноўныя фактары, якія ўплываюць на народную манеру спеваў, распрацаваць тэарэтычна-метадычныя палажэнні ў сферы навучання народнай манеры, якія б забяспечвалі ўдасканаленне падрыхтоўкі кадраў.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя **задачы:**

1. Вызначыць сутнасць і змест народнапесенных традыцый Беларусі і выявіць тыя спецыфічныя асаблівасці, якія неабходны для навучання ў аматарскіх гуртах і ВНУ культуры.

2. Вывучыць стан падрыхтоўкі кіраўнікоў фальклорных гуртоў і народных хароў.

3. Навукова абгрунтаваць агульныя і спецыфічныя прынцыпы навучання народнай манеры спеваў.

4. Распрацаваць спецыяльную методыку па авалодванню народнай манерай спеваў і вызначыць шляхі павышэння эфектыўнасці навучальнага працэсу.

5. Эксперыментальна апрабаваць метадычныя рэкамендацыі і ўстаноўкі па ўдасканаленню навучання народнай манеры спеваў.

**Аб'ект даследавання** — працэс навучання народнай манеры спеваў у музычных установах і аматарскіх фальклорных калектывах.

**Прадмет даследавання** — тэарэтычна-метадычныя аспекты ўдасканалення падрыхтоўкі кадраў у музычных установах і засваення народнапесенных традыцый у аматарскіх фальклорных калектывах.

Папярэдні аналіз праблемы дазволіў сфармуляваць **гіпотэзу**. Яна заключаецца ў тым, што захаванне і засваенне народнапесенных традыцый абумоўлены:

а) разглядам працэсу навучання народнай манеры спеваў як самастойнай педагагічнай з'явы з улікам рэгіянальнай спецыфікі выканання народнай песні;

б) разуменнем таго, што навучанне народнай манеры выканання звязана з захаваннем жанру песні, яе стылёвых і моўных рэгіянальных асаблівасцей, якія садзейнічаюць глыбокаму навукова-педагагічнаму асэнсаванню працэсу пераймання і ўзнаўлення гэтай традыцыі;

в) вызначэннем задач, зместу, формаў і метадаў навучання народнай манеры спеваў з улікам асноўных тэарэтычна-практычных прынцыпаў тэхналогіі засваення народнапесенных традыцый;

г) канструяваннем дзейсных накірункаў і метадаў авалодвання народнай манерай спеваў з улікам станоўчага вопыту навучання і існуючых методык.

**Металагічнай асновай** даследавання з'явіліся асноўныя палажэнні аб ролі фальклорных традыцый у жыцці народа і іх уплыве на спосаб жыцця, паводзіны, свядомасць асобнага чалавека; аб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уплыве народнага вакалу на агульнае развіццё навучэнцаў, іх станаўленне як прафесійных выканаўцаў; дыдактычныя прынцыпы і падыходы па актывізацыі навучання; палажэнні вакальнай педагогікі аб метадах навучання.

Для вырашэння пастаўленых у дысертацыйным даследаванні задач выкарыстоўваўся комплекс узаемазвязаных і ўзаемадапаўняючых навуковых **метадаў:** тэарэтычны аналіз крыніц навуковай і вучэбна-метадычнай літаратуры, вывучэнне і аналіз існуючых методык вакальнага навучання ў музычных установах і аматарскіх фальклорных калектывах, назіранне, інтэрв'юіраванне, анкетаванне, педагагічны эксперымент.

**Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць атрыманых вынікаў:**

— выяўлены асаблівасці народнапесенных традыцый Беларусі, сутнасць якіх заключаецца ў іх жанравай, стылёвай і моўнай разнастайнасці;

— пераасэнсаваны і актуалізаваны мэты і задачы засваення народнапесенных традыцый у музычных установах і аматарскіх гуртах з улікам рэгіянальных асаблівасцей, даецца сучасная трактоўка асноўных напрамкаў навучання народнай манеры спеваў, накіраваных на: а) засваенне ведаў аб асаблівасцях сольных і гуртавых спеваў; б) асваенне манеры народных спеваў і агульных прыёмаў традыцыйнага гукаўтварэння; в) авалоданне песеннымі стылямі розных рэгіёнаў Беларусі і практычнымі навыкамі імправізацыі;

— абгрунтаваны прынцыпы тэарэтычна-практычнага асэнсавання тэхналогіі засваення традыцыйных формаў народнапесеннага выканання ў адпаведнасці з мэтай навучання;

— распрацаваны асноўныя метады педагагічнай дзейнасці выкладчыка-кіраўніка, якія накіраваны на засваенне асноўных вакальных навыкаў і ўменняў выканання народнай песні: арганізацыю правільнага дыхання і артыкуляцыі, фарміраванне галосных (у акадэмічнай і бытавой манерах), выпрацоўку адзінай манеры гукаўтварэння;

— навукова аргументавана і эксперыментальна пацверджана методыка навучання народнай манеры спеваў, заснаваная на выкарыстанні традыцыйных нормаў выканання беларускай народнай песні;

— прапанавана сістэма працы з выканаўцамі народнай песні, якая з'яўляецца сродкам аптымізацыі вакальнага навучання, і прадугледжвае авалоданне асаблівасцямі акадэмізаванай і бытавой манерамі выканання.

**Практычная значнасць** атрыманых вынікаў прадвызначае магчымасць шырокага ўжывання на практыцы прапанаванай методыкі, удасканаленне навучальнага працэсу па авалоданню народнай манерай спеваў і захаванню народнапесенных традыцый Беларусі. Практычныя рэкамендацыі выкарыстоўваліся на занятках па пастаноўцы голасу і фальклорнага гурту ў Беларускім універсітэце культуры, у Мінскім вучылішчы мастацтваў, а таксама ў рэпетыцыйнай рабоце фальклорнага гурту "Шчодрыца" Мінскага Дома настаўніка. Укаранёна і апрабавана праграма вучэбнага курса "Фальклорны гурт" для падрыхтоўкі будучых кіраўнікоў фальклорных калектываў.



**Сацыяльна-эканамічная значнасць** праведзенага даследавання вызначаецца яго накіраванасцю на павышэнне эфектыўнасці народнага вакальнага навучання, што дазваляе ўдасканаліць прафесійны ўзровень кіраўнікоў народных хароў і фальклорных гуртоў, прафесійны ўзровень аматарскіх калектываў, захаваць народнапесенныя традыцыі як складаючую частку духоўных і культурных каштоўнасцей, фарміраваць нацыянальную свядомасць маладога пакалення.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. Сутнасць і змест народнапесенных традыцый, якія абапіраюцца на жанравую разнастайнасць народнай песні, яе стылёвыя асаблівасці і рэгіянальную мову і захоўваюцца шляхам вывучэння і пераймання папярэдняга вопыту носьбітаў гэтых традыцый.

2. Асноўныя прынцыпы тэарэтычна-практычнага асэнсавання тэхналогіі засваення традыцыйных формаў народнапесеннага выканання, якія ўключаюць: развіццё галасавых і творчых здольнасцей, адзінства мастацкага і тэхнічнага развіцця спеваў, слыхавое ўспрыманне і перайманне, улік вакальных магчымасцей голасу, індывідуальны характар навучання, калектыўны характар навучання, паслядоўнасць, сістэматычнасць і інш.

3. Фарміраванне вакальных уменняў і навыкаў з ужываннем розных методык: развучванне твора па нотах і нотных расшыфроўках, метад назірання за спевамі сялян, развучванне шляхам праслухоўвання магнітных стужак і з голасу выкладчыка-кіраўніка.

4. Асноўныя агульнадыдактычныя метады, якія спецыфічна праяўляюцца пры вырашэнні выканальніцкіх задач: 1) тлумачальна-ілюстрацыйны і рэпрадуктыўны (арганізацыя дыхання, гукаўтварэнне, артыкуляцыя, развіццё дыяпазону); 2) эўрыстычны і даследчы (адзіная манера спеваў, засваенне асаблівасцей дыялектаў, навыкі імправізацыі).

5. Шляхі і сродкі навучання народнай манеры спеваў, якія накіраваны на: 1) авалоданне спосабамі гукаўтварэння пры спевах калядак, вясенніх гукальных і карагодных песень, траецкіх, купальскіх, вясельных лірычных і танцавальных песень, вясельных галашэнняў, жніўных абрадавых народных твораў з ужываннем акадэмізаванай і бытавой манер выканання; 2) вывучэнне стылёвай разнастайнасці беларускай народнай песні і авалоданне навыкамі імправізацыі; 3) выкарыстанне асаблівасцей рэгіянальных гаворак з ужываннем фанетычнага метаду навучання як асноватворнага для дакладнага ўзнаўлення народнай песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Асабісты ўклад** суіскальніка заключаецца ў:

а) аналізе філасофскай, этнаграфічнай і вакальна-педагагічнай літаратуры па праблемах захавання народнапесенных традыцый;

б) выяўленні сутнасці, мэт і задач навучання народнай манеры спеваў у музычных установах і аматарскіх фальклорных калектывах;

в) распрацоўцы, навуковай аргументацыі і практычнай апрабацыі методыкі навучання народнай манеры спеваў, заснаванай на выкарыстанні асаблівасцей народнапесенных традыцый Беларусі;

г) правядзенні вопытна-эксперыментальнай работы ў Беларускім універсітэце культуры на кафедры беларускай народнай песеннай творчасці, у Мінскім вучылішчы мастацтваў і фальклорным гурце "Шчодрыца" Мінскага Дома настаўніка;

д) стварэнні праграмы курса "Фальклорны гурт";

е) распрацоўцы спецыяльнай сістэмы практыкаванняў па навучанню народнай манеры спеваў;

ж) стварэнні канцэртных праграм як сольных, так і гуртавых са студэнтамі Беларускага універсітэта культуры, Мінскага вучылішча мастацтваў, гуртом "Шчодрыца";

з) падрыхтоўцы навуковых, эксперыментальных і метадычных матэрыялаў для вопытна-педагагічнай і эксперыментальнай работы.

**Апрабацыя вынікаў даследавання**. Асноўныя вынікі даследавання былі прадстаўлены на навукова-практычных канферэнцыях у Беларускім універсітэце культуры: "Прафесіяналізм выкладчыкаў універсітэта ва ўмовах пераходу да шматузроўневай сістэмы адукацыі" (1-2.02.1994 г.), "Праблемы ўдасканалення гуманітарнай і прафесійнай адукацыі" (2-3.02.1995 г.), "Сістэма культуралагічнай адукацыі студэнтаў у вышэйшых навучальных установах рэспублікі" (3-4.02.1997 г.); на рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцыях: "Фальклор як сродак выхавання нацыянальнай свядомасці" (4.06.1993 г.), "Сацыяльна-педагагічныя і прававыя аспекты абароны дзіцяці і дзіцячых установаў у свеце Канвенцыі ААН аб правах дзіцяці" (19-21.04.1994 г.). Вынікі даследавання выкарыстоўваюцца на практычных занятках па пастаноўцы голасу і фальклорнага гурту на кафедры беларускай народнай песеннай творчасці Беларускага універсітэта культуры. Па матэрыялах даследавання на Беларускім радыё і тэлебачанні былі арганізаваны перадачы аб творчай дзейнасці аматарскага фальклорнага гурту "Шчодрыца" Мінскага Дома настаўніка.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя ўключае ўвoдзіны, дзве главы, заключэнне, спіс выкарыстанай літаратуры, дадаткі. Агульны аб'ем дысертацыі 116 старонак, у лік якіх уваходзіць спіс выкарыстанай літаратуры.

**Асноўны змест дысертацыі.**

Ва ўводзінах і агульнай характарыстыцы працы абгрунтоўваюцца выбар тэмы даследавання, яе актуальнасць, распрацаванасць праблемы на сучасным этапе, вызначаюцца аб'ект, прадмет, мэта і задачы даследавання, выкладаюцца гіпотэза, метадалагічная аснова, сфармуляваны палажэнні аб навізне, тэарэтычнай, практычнай, сацыяльна-эканамічнай значнасці даследавання.



Першая глава "Педагагічныя праблемы вывучэння народнапесенных традыцый у аматарскай творчасці і ў сістэме музычнай адукацыі" складаецца з двух параграфаў.

У параграфе 1.1. "Асаблівасці традыцый народнапесеннага фальклору Беларусі" раскрываюцца тэарэтычныя асновы праблемы захавання народнапесенных традыцый Беларусі, аналізуюцца прычыны ўзнікнення цікавасці даследчыкаў да праблемы, высвятляюцца якасна розныя навуковыя падыходы да вырашэння гэтай праблемы, абгрунтаваныя ў працах даследчыкаў многіх школ і накірункаў, паказаны роля народнапесенных традыцый у жыцці народа, педагагічная значнасць фальклорна-песеннага мастацтва. Рэтраспектыўны агляд формаў бытавання фальклору, аналіз яго сучаснага становішча, прагназіраванне далейшага развіцця — усё гэта дазволіла з навуковых пазіцый абгрунтаваць сутнасць працэсаў, якія адбываюцца ў фальклорным мастацтве, вызначыць ролю народнапесенных традыцый у духоўным развіцці чалавека.

Як ніколі, узнікла пытанне аб выжыванні народнапесенных традыцый у новым грамадстве і ў новым эканамічным становішчы. Актуальнасць і злабадзённасць праблем, звязаных з узнікненнем сцэнічнага, стылізаванага фальклору і захаваннем народнапесенных традыцый выкліканы своеасаблівым фальклорным рухам, характэрным для апошніх гадоў. Аднак адсутнасць неабходных практычных парад уносіць элементы стыхійнасці ў гэты рух. Актыўная дзейнасць фальклcraрыстаў накіравана на тое, каб як мага больш сабраць, сістэматызаваць і тым самым захаваць знікаючыя формы і ўзоры песеннага фальклору.

Аналіз прац па тэме даследавання дазволіў вызначыць асноўныя асаблівасці народнапесеннага фальклору Беларусі, звязаныя з жанравай, стылёвой разнастайнасцю, рэгіянальнымі дыялектамі. Вельмі каштоўнымі з'яўляюцца працы аб сацыяльным пераасэнсаванні беларускіх жніўных песень (З.В.Эвальд), аб асаблівасцях і распаўсюджанні вясельных песень (К.В.Квітка, Т.Б.Варфаламеева), аб песеннай культуры ўсходнеславянскіх народнасцей (В.І.Ялатаў). Найбольш значнымі для нашага даследавання з'яўляюцца палажэнні З.Я.Мажэйкі аб традыцыі спеваў на Беларускім Палессі на прыкладзе в.Тонеж Гомельскай вобласці.

Шчыльна звязаны з пытаннем станаўлення народнапесенных традыцый разгляд асаблівасцей творчай працы аматарскіх фальклорных гуртоў, працуючых як у бытавой, так і ў акадэмізаванай манеры спеваў. Ён дазволіў выявіць асноўныя метадычныя накірункі творчай працы ў гэтых калектывах і ступень захаванасці традыцый-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных нормаў выканання беларускай народнай песні (А.М.Аляхновіч, А.С.Кабанаў, І.В.Несцьеў, Г.І.Цітовіч).

У дысертацыі сцвярджаецца думка, што народная манера спеваў — гэта не толькі ўласцівасць, звязаная з асаблівасцямі галасавога апарату, тыпам дыхання, тэмбральнымі асаблівасцямі. Гэта манера фарміруецца на падставе гуртавых спеўных традыцый на працягу доўгага часу. Творчая актыўнасць кожнага ўдзельніка гурту мае вялікае значэнне і з'яўляецца вызначальнай у працэсе выканання. Належнасць гучнага, моцнага голасу, уменне імправізаваць і вар'іраваць меладычны малюнак, добрае веданне звычаяў і абрадаў — тыя крытэрыі, якія даюць канкрэтныя ўстаноўкі пры навучанні народным спевам і з'яўляюцца арыенцірам для вывучэння тэхналогіі выканання народнай песні.

Вывучэнне рэгіянальных песенных асаблівасцей павінна ісці паралельна з асэнсаваннем гутарковасці ў народных спевах. Песня і слова непарыўна звязаны паміж сабой. Ужыванне фанетычнага метаду на занятках па пастаноўцы голасу дазваляе глыбей зразумець характар функцыянальных працэсаў спеваў і ў той ці ў іншай ступені эфектыўна кіраваць імі.

У параграфе 1.2. "Асноўныя прынцыпы тэарэтычна-практычнага асэнсавання тэхналогіі засваення традыцыйных формаў народнапесеннага выканання" на падставе вывучэння педагагічнага вопыту сфармуляваны асноўныя прынцыпы навучання народнай манеры спеваў. Разглядаецца іх роля ў сістэме падрыхтоўкі кіраўнікоў народных хароў і фальклорных гуртоў.

Вучэбная праца па засваенню народнапесенных традыцый падзяляецца на вучэбна-арганізацыйную, вучэбна-пазнавальную і вучэбна-творчую. Усе гэтыя формы працы шчыльна звязаны паміж сабою і дазваляюць вырашыць праблемы фарміравання рэпертуару, вывучэння рэгіянальнай манеры выканання, стыляў і ўдасканалення вакальнага майстэрства.

У дысертацыі адзначаецца, што педагагічны працэс аб'ектыўна выступае як сфера супрацоўніцтва выкладчыка-кіраўніка і студэнта-ўдзельніка. Навучанне спевам — гэта мэтанакіраванае засваенне індывідам сацыяльна апрацаванага вопыту, практычных і навуковых, эмпірычных і тэарэтычных ведаў ва ўмовах арганізаванага навучання. Вынікам сумеснага супрацоўніцтва і дзейнасці выкладчыка і навучэнцаў з'яўляецца творчая актыўнасць у засваенні традыцый. Якасны бок гэтай працы праяўляецца на заліках, іспытах і канцэртных выступленнях.

Методыка вакальнага навучання народнай манеры спеваў абапіраецца на агульнадыдактычныя і спецыяльныя прынцыпы. Галоўнымі для нашай сферы з'яўляюцца наступныя прынцыпы: развіццё галасавых і творчых здольнасцей у працэсе навучання, захаванне адзінства мастацкага і тэхнічнага майстэрства пры выка-



нанні песні, ажыццяўленне слыхавога ўспрымання, пераймание, мэтанакіраваная праца па кіраванні голасам у практычнай дзейнасці, набыццё індывідуальнага характару выканання, паслядоўнасць у навучанні і калектыўны характар выканання і, нарэшце, прынцыпы магчымай цяжкасці, сістэматычнасці і творчага мыслення.

Глыбокае вывучэнне спецыфікі выканання народнай песні ў розных рэгіёнах Беларусі (Гомельская і Брэсцкая вобл., Паазер'е, Панямонне, Мінская вобл.), а іменна іх стылістыкі, жанраў, прыёмаў гукавыцягвання і гукаўтварэння, асаблівасцей гаворкі разглядаюцца ў кантэксце практычнага ўзнаўлення на занятках з ужываннем розных методык навучання.

Азнаямленне з прынцыпамі тэхналогіі засваення традыцыйных нормаў народнай манеры спеваў Беларусі не можа праходзіць ізалявана ад практычнага ўжывання кожнага з іх у навучальным працэсе.

Другая глава "Асаблівасці падрыхтоўкі кіраўнікоў народных хароў і фальклорных гуртоў з улікам традыцый народнапесеннага выканання".

У параграфе 2.1. "Агульная характарыстыка эксперыментальнай працы" даецца абгрунтаванне абранага накірунку дысертацыйнай працы, апісваюцца методыка, мэты, змест і працэдура даследавання.

Эксперыментальная праца мела на мэце апрацоўку і праверку элементаў прапанаванай намі методыкі навучання народнай манеры спеваў. Змест эксперыментальнай працы прадугледжваў: абгрунтаваны выбар аптымальных для вывучэння вакальных практыкаванняў, апрабаванне прапанаванай методыкі навучання, выяўленне эфектыўнасці навучання пры выкарыстанні гэтай методыкі.

У параграфе 2.2. "Стан падрыхтоўкі кіраўнікоў народных хароў і фальклорных гуртоў па захаванню народнапесенных традыцый" прааналізаваны шляхі падрыхтоўкі спецыялістаў у нашай рэспубліцы, вывучаны існуючыя методыкі навучання народнай манеры спеваў.

Сістэма падрыхтоўкі кадраў у галіне народнапесеннага выканання пачала складацца яшчэ ў 20-я гады. Доўгі час падрыхтоўка вялася ў напрамку акадэмічных спеваў. У 30-я гады ўзнікае мноства народных хароў і гуртоў, і цікавасць да народных спеваў узрастае. У сувязі з адраджэннем традыцый народнапесеннага выканання, з'яўленнем навуковых адкрыццяў стала магчымым растлумачыць мноства з'яў, звязаных з механізмам утварэння голасу, тэхнікі дыхання.

Для беларускай вакальнай школы народных спеваў на сучасным этапе характэрна высокая ступень развіцця. Назапашаны каштоўны вопыт канцэртнай дзейнасці, збірання фальклору, вывучэння рэгіянальных асаблівасцей беларускай народнай песні дае падставу для стварэння навукова абгрунтаванай методыкі навучання народнай манеры спеваў на Беларусі. Мы ўважліва вывучылі распрацоўкі Н.К.Мяшко, Н.В.Калугінай, У.М.Шчурава, А.С.Кабанава,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Л.Л.Хрысціянсана і прыйшлі да высновы, што кожная з методык накіравана на захаванне нацыянальных песенных традыцый, на шчыльную ўзаемасувязь са знаўцамі традыцыі, на выкарыстанне навуковых даследаванняў у галіне вакальнай педагогікі. Уся вакальна-метадычная падрыхтоўка павінна прадугледжваць устанаўленне прычынна-выніковых залежнасцей паміж з'явамі песеннага працэсу, які абапіраецца на аналіз гукаўтварэння (вынік) і тэхналогію гукаўтварэння (прычына).

У беларускім песенным фальклоры скалаліся свае, мясцовыя вакальныя школы. Запісы З.Я.Мажэйкі, З.В.Эвальд, В.І.Ялатава, Г.І.Цітовіча, А.С.Ліс, Т.Б.Варфаламеевай, У.І.Раговіча каштоўныя тым, што песні запісаны ад знаўцаў мясцовага песеннага стылю. Аб'яднанне тэарэтычных ведаў і практычнай працы вядзе да стварэння спецыфічных прыёмаў навучання. Для гэтага ў Беларускім універсітэце культуры створаны вучэбныя эксперыментальныя гурты "Валачобнікі" і "Грамніцы", у Мінскім музычным вучылішчы гурт "Медуніца", у Мінскім вучылішчы мастацтваў гурт "Дзіва". Кіраўнікі названых калектываў па-рознаму ўвасабляюць народную песню на сцэне і імкнуцца ўжываць новыя прыёмы па развучванню песень: праслухоўваюць магнітныя стужкі, працуюць з нотнымі расшыфроўкамі, развучваюць песні з голасу і інш.

Наведванне рэпетыцый аматарскіх фальклорных гуртоў "Церніца" (Мінскі Палац чыгуначнікаў), "Рунь" (Мінскі тэхналагічны універсітэт), "Неруш" (БДУ), "Ярыца" (будаўнічы трэст № 1 г.Мінска) паказала, што не ўсе кіраўнікі ўлічваюць рэгіянальныя асаблівасці беларускай народнай песні. Адсюль шаблоннае гучанне песень, аднолькавы рэпертуар у калектывах, адсутнічаюць творчы рост і вакальнае майстэрства.

У ходзе дысертацыйнага даследавання намі была распрацавана анкета па выяўленню асноўных патрабаванняў і ўмоў па захаванню народнапесенных традыцый. Сярод рэспандэнтаў былі студэнты Беларускага універсітэта культуры кафедры беларускай народнапесеннай творчасці дзённага і завочнага навучання, навучэнцы Мінскага вучылішча мастацтваў аддзялення харавога дырыжыравання, удзельнікі аматарскага гурту "Шчодрыца", вучэбных гуртоў "Валачобнікі", "Грамніцы" Беларускага універсітэта культуры (усяго 210 чалавек).

Усе рэспандэнты лічаць, што праблема захавання рэгіянальных песенных традыцый вельмі актуальная. Найбольш важнымі ў іх захаванні яны лічаць манеру выканання, стылёвыя асаблівасці песні, жанр народнай песні. Рэспандэнты адзначылі, што неабходна выкарыстоўваць як бытавую, так і акадэмізаваную манеры выканання, адначасова шукаць новыя формы ўзнаўлення песні.

Самым эфектыўным спосабам для авалодвання народнай манерай спеваў навучэнцы лічаць пераймание вопыту выкладчыка, а ўжо потым народнага выканаўцы, носьбіта традыцый.



У параграфе 2.3. "Асноўныя метадычныя накірункі навучання народнай манеры спеваў" прадстаўлена падрабязная метадычная распрацоўка, якая ўяўляе сабой дынамічную развіццёвую сістэму з паступовым уключэннем новых пазіцый і іх выкарыстаннем у комплексе пры засваенні беларускай народнай песні як у сольным, так і ў гуртавым выкананні. Спецыяльна створаныя практыкаванні падмацоўваюцца мэтанакіраванымі ўстаноўкамі.

Кожнай устаноўцы адпавядаюць спецыяльныя заданні, узоры беларускіх народных песень розных рэгіёнаў, дзе найбольш яскрава ўвасоблены спецыфічныя рысы традыцыі. Практыкаванні паступова ўскладняюцца, прапануюцца новыя формы працы над голасам у гурце і індывідуальна. Пераход ад індывідуальных заняткаў да гуртавых і наадварот дазволіў сачыць за эфектыўнасцю прапанаваных метадаў вакальнага навучання. Навуковая арганізацыя навучання дазволіла паказаць студэнтам шляхі, метады і сродкі рацыянальнага авалодвання імі, выяўлення эфектыўнасці і кантролю за імі.

Вакальна-педагагічная дзейнасць у канчатковым выніку арыентавана на вырашэнне выканальніцкіх задач. Гэтыя задачы першнаперш накіраваны на авалодванне асноўнымі рысамі народнапесеннага выканання ў рамках мясцовай традыцыі. Для гэтага вельмі важна наступнае: 1) непасрэднае ўздзеянне выкладчыка-кіраўніка на працэс авалодвання народнай манерай спеваў; 2) арганізацыя на падставе самастойнага ўключэння навучэнцаў у авалодванне народнай манерай з улікам ужо сфарміраваных вучэбна-пазнавальных каштоўнасцей, здольнасцей, ведаў; 3) праверка набытых ведаў, уменняў і навыкаў у канцэртнай дзейнасці.

У авалодванні і захаванні народнай манеры спеваў вялікае значэнне мае работа над якасцю гуку. Аналіз спецыфічных метадаў і прыёмаў, існуючых сення ў вакальнай педагогіцы, паказаў, што ўсе яны ў асноўным накіраваны на стварэнне тых ці іншых умоў для работы гартані ў пэўным галасавым рэжыме, што звязана з веданнем значэння рэгістраў голасу.

Выкарыстанне паўпрыкрытай манеры спеваў, дзе часткова ўдзельнічаюць галаўны і грудны рэзанатары, сведчыць аб прафесійным валоданні народнай манерай спеваў. Аналізуючы вопыт навучання, мы прыйшлі да высновы, што натуральнае адкрытае гукаўтварэнне дасягаецца ў тым выпадку, калі: 1) грудны пасыл гуку адпавядае адчуванню апоры гуку на нізка апушчаную дыяфрагму; 2) прысутнічае фізічнае адчуванне свабоды спеваў; 3) нізкае становішча гартані садзейнічае высокаму становішчу мяккага паднябення; 4) захоўваецца адзінае, замацаванае на кожным галосным, становішча ротаглотачнай поласці; 5) артыкуляцыйны апарат, асабліва сківіца, свабодна рухаецца, а палажэнне мяккага паднябення актыўнае.

Практыкаванні сістэматызуюцца па ступені цяжкасці і маюць канкрэтную тэхнічную задачу: для індывідуальных заняткаў, гурта-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вых спеваў; для развіцця голасу і выпрацоўкі тэхнічных прыёмаў; для знаходжання высокай пеўчай пазіцыі; для пашырэння дыяпазону; для згладжвання рэгістраў (груднога і галаўнога); для адпрацоўкі кантылены, роўнасці голасавядзення, адзінай манеры гукаўтварэння; для набыцця артыкуляцыйных навыкаў; для развіцця імправізацыі; для адпрацоўкі чысціні інтанацыі, гарманічнага слыху.

Асэнсаванне гутарковай асновы ў народных спевах паказала, што моўную інтанацыю неабходна ўзяць у якасці аднаго з галоўных элементаў у вакальным навучанні. Абагульняючы літаратурныя даныя, а таксама вынікі асабістых даследаванняў, аналізуючы і супастаўляючы гучанне народных песень у бытавой і акадэмізаванай манерах, мы прапануем ужыванне фанетычнага метаду як аднаго з асноватворных у навучанні (М.І.Глінка, В.П.Савельева, Л.В.Шаміна).

Мы прынялі за аснову практыкаванні, у якіх мэтанакіравана выкарыстоўваюцца сродкі фанетычнага метаду. У гэтых практыкаваннях вялікае значэнне надаецца арганізуючай ролі фарміравання галосных гукаў у іх правільным літаратурным вымаўленні. У такіх практыкаваннях прадугледжваюцца лагічны пераход ад прапявання адной галоснай да другой, супастаўленне іх паміж сабою артыкуляцыйна і па складанасці вымаўлення. Калі ў стылізаванай манеры выкарыстоўваецца канкрэтнае вымаўленне галоснага, то бытавая абапіраецца на дыялектную аснову песні і набывае спецыфіку "прыблізнага" гучання галосных гукаў. Падрыхтоўка галасавога апарату пад пэўны гук дае магчымасць усе астатнія гукі падпарадкаваць гэтаму "галоўнаму" галоснаму (напрыклад, [ы] ў ыкаючай ці [а] ў акаючай гаворцы).

Для развіцця навыкаў імправізацыі, даволі складаных у гуртавых спевах, неабходны, па-першае, аналіз пачутага, паўтор меладычнага малюнка ва унісон. Па-другое, вельмі важныя спроба будаваць другі, трэці голас, падстройванне падводкі і, нарэшце, спевы розных практыкаванняў з выкарыстаннем меладычных абаротаў.

У параграфе 2.4. "Уплыў узроўню падрыхтоўкі кіраўнікоў народных хароў і фальклорных гуртоў на захаванне і засваенне рэгіянальных народнапесенных манер" даецца апісанне вынікаў і ўкаранення прапанаванай намі методыкі навучання народнай манеры спеваў.

Педагагічны эксперымент праходзіў у чатыры этапы.

Першы этап — пошукавы: вызначэнне мэты, аб'екта, прадмета, задач і метадаў збору эмпірычных даных, асноўных тэарэтычных палажэнняў, фарміраванне асноўных паняццяў і распрацоўка праграмы эксперыментальнага даследавання.

Другі этап — пошукава-канстатуючы: вывучэнне фактараў, якія ўплываюць на народную манеру спеваў і выяўленне прынцыпаў навучання.



Трэці этап — фарміруючы: мадэліраванне і апрабацыя комплекснай праграмы навучання і захавання народнапесенных традыцый.

Чацвёрты этап — завяршальна-абагульняючы: аналіз эксперыментальных даных, фарміраванне тэарэтычных вынікаў і метадычных рэкамендацый, укараненне вынікаў даследавання ў практыку работы са студэнтамі і ўдзельнікамі фальклорных гуртоў.

Навучанне праводзілася адным выкладчыкам-кіраўніком на працягу трох гадоў. У эксперыментальным класе было 10 студэнтаў.

У класе з дапамогай выкладчыка навучэнцы авалодвалі навыкамі народных спеваў (тэхнікай дыхання, спосабамі гукаўтварэння, гукавыцягвання, тэхнічнымі вакальнымі прыёмамі, спевамі народнай мелізматыкі). Мы сачылі за развіццём вакальнага майстэрства студэнтаў і эфектыўнасцю ўспрыняцця прапанаваных практыкаванняў.

Дыягностыка ўменняў ажыццяўлялася экспертамі з ліку выкладчыкаў кафедры пры дапамозе крытэрыяў ацэнкі, выпрацаваных намі.

Для параўнання вынікаў былі ўзяты наступныя характарыстыкі якасцей голасу: гукавысотны дыяпазон, артыкуляцыя, рухомасць. З мэтай вызначэння эфектыўнасці метадаў навучання пасля кожнага этапу праводзіліся замеры вынікаў дзвюх груп (выніковы зрэз), супастаўляліся дадзеныя эксперыментальнай і кантрольнай груп, фіксаваліся вынікі кожнай серыі практыкаванняў і заданняў. Пры планаванні эксперыментальнай працы і ў канцы кожнага этапу асаблівая ўвага звярталася на ўзровень засваення і выканання студэнтамі заданняў, якія падбіраліся з пэўнымі мэтавымі ўстаноўкамі.

Дыягнастычны замер паказаў, што пры сістэматычным і паслядоўным ўжыванні прапанаваных метадычных прыёмаў поспехі былі амаль ва ўсіх студэнтаў. Пры гэтым найбольш высокіх паказчыкаў дасягнулі студэнты з выдатнымі галасавымі данымі. Іх дыяпазон пашырыўся да паўтары актавы. 90% навучэнцаў ліквідавалі недахопы ў дыкцыі і рухомасці голасу. Вывучэнне адказаў рэспандэнтаў наконт асноўных цяжкасцей у авалодванні народнай манерай паказала, што на першае месца яны ставяць аб'яднанне груднога і галаўнога рэгістраў. Дадзены факт пацвердзіўся на практычных занятках. Згладжваць рэгістравыя пераходы навучылася толькі трыццаць працэнтаў студэнтаў.

Аналізуючы традыцыю выканання беларускай народнай песні, практыку вакальнай работы са студэнтамі і ў аматарскім гурце, мы заўважылі, што сцэнічнае пераўтварэнне народнага твора, звязанае з яго мастацкім вобразам, жанрам, уплывае на манеру выканання, уздзейнічае на афарбоўку голасу, мае своеасаблівы спосаб гукаўтварэння і адпаведны эмацыянальны настрой. У сувязі з гэтым студэнтам было прапанавана выканаць розныя па жанравай прыналежнасці і эмацыянальнаму настрою беларускія народныя песні "Няхай будзе пагодачка" (жніўная) і "Рэчанька" (лірычная). Усе студэнты

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выдатна выканалі гэтыя творы, паказаўшы высокі тэхнічны ўзровень выканання. Што датычыцца лірычнай песні, якую неабходна спяваць "ціхім" голасам, па-сапраўднаму прафесійна выканалі яе толькі два студэнты з дзесяці апытаных. Было высветлена, што найбольш станоўчых вынікаў дасягнулі студэнты эксперыментальнай групы, якія на працягу навучання спявалі ў акадэмізаванай манеры спеваў (паўпрыкрытай). Гэтыя студэнты маглі спяваць розныя па жанру песні з пашыраным дыяпазонам.

Такім чынам, грунтуючыся на атрыманым матэрыяле, мы канстатуем той факт, што акадэмізаваная манера спеваў аказалася больш перспектыўнай, таму што дазваляе раскрыць і палепшыць усе магчымасці голасу, стварыць умовы для выканання разнастайнага рэпертуару.

Акрамя гэтага, адной з задач нашага даследавання было вывучэнне ўплыву дыялектаў беларускай мовы на манеру выканання.

Згодна з вынікамі анкетавання, дамінуючым у сістэме навучання народным спевам з'яўляюцца мова, асаблівасці гаворак.

Пасля індывідуальнай падрыхтоўкі студэнтаў па прадмету "Пастаноўка голасу" навучэнцы працягваюць навучанне па курсу "Фальклорны гурт". Каб высветліць значэнне дыялектнага вымаўлення, мы звярнуліся да фанетычнага метаду. У час практычных заняткаў былі выкарыстаны два шляхі: выкананне песні з уплывам літаратурнай мовы і спевы з рэгіянальным вымаўленнем. Супастаўленне вынікаў эксперыментальнай групы (вучэбны гурт Беларускага універсітэта культуры) і кантрольнай групы (Мінскае вучылішча мастацтваў, вучэбны хор) высветліла, што спевы аднаго і таго ж твора на літаратурнай мове і дыялекце маюць рознае гучанне.

Параўнальная характарыстыка праводзілася пасля выканання народных твораў з розных рэгіёнаў Беларусі. У прыватнасці, адной з такіх песень была беларуская народная песня, запісаная ў Пінскім раёне "Ізвылы вэнка із зэленого клёну".

Такім чынам, у выніку праведзенага эксперыменту пры спевах на літаратурнай мове вызначыліся наступныя якасці ў гучанні: 1) блізкае рэзаніраванне галосных і дакладнае іх вымаўленне; 2) адкрытае гучанне галосных у зручным дыяпазоне і прыкрытае на верхніх гуках; 3) вымаўленне зычных у адпаведнасці з нормамі літаратурнай мовы.

Пры спевах на дыялекце: 1) недакладнае вымаўленне галосных гукаў, прыкрытае рэзаніраванне, калі гэта "окаючая" ці "юкаючая", ці "экаючая" гаворкі; 2) адкрытае гучанне галосных на ўсім дыяпазоне; 3) вымаўленне зычных у адпаведнасці з рэгіянальнымі асаблівасцямі мовы.

Далей даследаванне прадугледжвала выкананне пазіцый імправізатара і пераймальніка народнай манеры спеваў.



Эксперыментальнай і кантрольнай групам стварылі аднолькавыя ўмовы, г. зн. прапанавалі вывучыць беларускія народныя песні "Вясняначка", "Ні жар загаряе" і "Што й на нашай на вуліцы", запісаныя на Гомельшчыне. Аднак эксперыментальная група развучвала названыя творы шляхам слыхавога ўспрымання з запісу фальклорнага матэрыялу. Кантрольная група развучвала тыя ж творы па нотах. Увогуле выкананне твораў мела добры прафесійны ўзровень і адпавядала ўсім параметрам выканання беларускай народнай песні. Аднак эксперыментальная група прадэманстравала больш блізкі да арыгінала варыянт твора з элементамі імправізацыі.

У эксперыментальнай групе на першым этапе навучання на высокім ўзроўні слыхавога ўспрымання знаходзіўся адзін студэнт з групы, на высокім ўзроўні галасавога ўзнаўлення два студэнты і на ўзроўні эмацыянальнага ўзнаўлення песні не было ніводнага студэнта. На другім этапе навучання навыкі студэнтаў удасканальваліся, і высокі ўзровень мелі амаль усе студэнты.

У кантрольнай групе слыхавое ўспрыманне песні на першым этапе было добрае амаль ва ўсіх студэнтаў, але галасавое ўзнаўленне і эмацыянальнае адчуванне песні на першым і апошнім этапах не мелі значнага адрознення.

Для паляпшэння навыкаў імправізацыі прапаноўваліся спецыяльныя практыкаванні. Студэнты эксперыментальнай групы лепш засвойвалі прапанаваныя практыкаванні, таму што мелі папярэдні вопыт слыхавога ўспрыняцця музычнага матэрыялу, калі праслухоўвалі магнітныя стужкі. Кантрольная група лепш засвойвала тыя практыкаванні, у якіх выкарыстоўвалася расчапленне галасоў на тэрцыю.

Для таго, каб вызначыць узровень успрыняцця меладычных узораў у фальклорным гурце, мы размеркавалі некалькі практыкаванняў па ступені цяжкасці і сістэматычна ўжывалі іх на рэпетыцыях. Удзельнікам прапанавалася раскласці мелодыю на галасы. Навучанне праводзілася ў тры этапы. На першым этапе аднагалосы варыянт мелодыі ўзнавілі 100% удзельнікаў, двухгалосы — 50%, а трохгалосы — 10%. На другім этапе навучання вынікі палепшыліся, і двухгалосы варыянт мелодыі ўзнавілі 60% удзельнікаў, а трохгалосы — 25%. На трэцім этапе двухгалосы варыянт праспявалі 100% удзельнікаў, а трохгалосы — 50%. На апошнім этапе навучання высветлілася, што, дзякуючы прапанаваным практыкаванням, паказчыкі навучання палепшыліся. Разам з тым мы заўважылі, што больш складаныя практыкаванні засвойваюцца большасцю навучэнцаў вельмі павольна ці зусім не засвойваюцца. Можна меркаваць, што якасць вакальнай імправізацыі залежыць не столькі ад музычнага выхавання, колькі ад умення кіраваць голасам і слыхавога пачуцця.

Вынікі трохгадовай апрабацыі методыкі паказалі істотныя зрухі ў фарміраванні ўменняў і навыкаў па авалодванні народнай мане-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рай спеваў. Эксперыментальная праца садзейнічала росту цікавасці да захавання рэгіянальных манер і жадання пераадолець цяжкасці ў працэсе выканання беларускай народнай песні.

**Вывады :**

У выніку праведзенага навуковага даследавання сфармуляваны наступныя асноўныя вывады.

1. Навучанне народнай манеры спеваў з'яўляецца неад'емнай часткай працэсу па захаванню народнапесенных традыцый. У аснове зместу такога навучання ляжаць глыбокае вывучэнне і засваенне жанру беларускай народнай песні, яе стылёвых асаблівасцей і рэгіянальнай спецыфікі гаворак.

2. Выяўленыя ў выніку даследавання асаблівасці падрыхтоўкі спецыялістаў дапамагаюць мэтанакіравана сканцэнтраваць дзейнасць выкладчыкаў-кіраўнікоў у ВНУ культуры і аматарскіх гуртах. Адначасова гэтыя асаблівасці забяспечваюць аргументацыю прынцыпаў вакальнай падрыхтоўкі кадраў, а таксама асноўных накірункаў авалодвання тэарэтычна-практычнымі ўменнямі і навыкамі народнай манеры спеваў.

3. Асноўныя накірункі працы па захаванню народнапесенных традыцый заключаюцца ў арганізацыі індывідуальнай працы са студэнтамі, а таксама на занятках па авалодванню навыкамі гуртавых спеваў. У працэсе навучання адбываецца паўнацэннае станаўленне студэнта як знаўцы традыцыйных нормаў выканання беларускай народнай песні. Яго вакальнае і музычна-сцэнічнае майстэрства ўдасканальваецца шляхам ужывання спецыяльна распрацаванай сістэмы канкрэтных практыкаванняў, якія накіраваны на павышэнне якасці засваення акадэмізаванай і бытавой манер выканання.

4. Найбольш эфектыўнымі метадамі па авалодванню народнай манерай спеваў з'яўляюцца тлумачальна-ілюстрацыйны, рэпрадуктыўны, эўрыстычны і даследчы метады навучання. Яны дапамагаюць актывізаваць слыхавую ўвагу і накіраваны на ўспрыняцце і запамінанне гукавога эталона. Для авалодвання спецыфікай рэгіянальных гаворак вельмі каштоўным з'яўляецца ўжыванне фанетычнага метаду.

5. Працэс удасканалення арганізацыі навучання народнай манеры спеваў у аматарскіх гуртах і падрыхтоўкі кадраў у ВНУ культуры павінен прадугледжваць разнастайнасць тыпаў аматарскіх фальклорных калектываў і выкарыстоўваць канкрэтныя спецыфічныя метады з улікам творчых накірункаў і рэгіянальнай прыналежнасці народных хароў і фальклорных гуртоў.



**Па тэме дысертацыі апублікаваны наступныя работы:**


1. Да пытання аб захаванні народнапесенных традыцый у фальклорных харавых калектывах Беларусі // Пытанні культуры і мастацтва Беларусі: Рэсп. межвед. зб. навук. пр. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь. Мін. ін-т. культуры; Гал. рэд. Я.Д.Грыгаровіч. — Мн.: Выш. школа, 1993. - Вып. 12. - С. 126-132.

2. Навучанне кіраўнікоў фальклорных калектываў народнай манеры спеваў // Культуралагічная падрыхтоўка студэнтаў у сістэме ВНУ: Даклады, прачытаныя на навук.-метад. канф. (4-5 лютага 1997 г.).- Мн.: Бел. ун-т культуры, 1997.- С.209-218.

3. Воспитательное воздействие народнопесенных традиций на детей // Социально-педагогические и правовые аспекты защиты личности ребенка и детских организаций в свете Конвенции ООН о правах ребенка и закона Республики Беларусь "О правах ребенка": Матэрыялы навук.-практ. канф.: У 2-х ч. - Мн.: ІПК і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі, 1994.- Ч.2 — С. 117.

4. Арганізацыя вучэбнага працэсу па курсу "Фальклорны гурт" // Прафесіяналізм выкладчыкаў універсітэта ва ўмовах пераходу да шматузроўневай сістэмы адукацыі: Матэрыялы навук.- метад.канф. /Мін-ва культуры і друку Рэсп. Беларусь. Беларускі універсітэт культуры; Адк. рэд. А.І.Смолік. — Мн.: Бел. ун-т культуры, 1994. — С. 93.

5. Засваенне асаблівасцей народнапесенных традыцый у працэсе падрыхтоўкі кіраўнікоў фальклорных калектываў // Праблемы ўдасканалення гуманітарнай і прафесійнай адукацыі: Матэрыялы навук.-метад. канф. / Мін-ва культуры і друку Рэсп. Беларусь. Беларускі універсітэт культуры; Адк. рэд. А.І.Смолік. — Мн., 1995. — С. 42-43.

6. Фальклорны гурт: Праграма курса — Мн.: Бел. ун-т. культуры. — 1996. — 11с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЭЗЮМЕ


Грамовіч Ірына Міхайлаўна “Педагагічныя аспекты навучання народнай манеры спеваў з улікам рэгіянальных песенных традыцый Беларусі”

**Ключавыя словы:** народнапесенная традыцыя, вакальная педагогіка, народная манера спеваў, вакальнае выхаванне, бытавая манера спеваў, акадэмізаваная манера спеваў, рэгіянальныя асаблівасці мовы, жанравая разнастайнасць народнай песні.

**Аб’ект даследавання** — працэс навучання народнай манеры спеваў у музычных установах і аматарскіх фальклорных калектывах.

**Прадмет даследавання** — тэарэтычна-метадычныя аспекты ўдасканалення падрыхтоўкі кадраў у музычных установах і засваення народнапесенных традыцый у аматарскіх фальклорных калектывах.

**Мэта даследавання** — раскрыць асноўныя фактары, якія ўплываюць на народную манеру спеваў, распрацаваць тэарэтычна-метадычныя палажэнні ў сферы навучання народнай манеры, якія б забяспечвалі ўдасканаленне падрыхтоўкі кадраў.

**Асноўныя метады**: тэарэтычны аналіз крыніц навуковай і вучэбна-метадычнай літаратуры, вывучэнне і аналіз існуючых методык вакальнага навучання ў музычных установах і аматарскіх фальклорных калектывах, назіранне, інтэрв’юіраванне, анкетаванне, педагагічны эксперымент.

У выніку праведзенага дысертацыйнага даследавання атрыманы паказчыкі, навізна якіх заключаецца ў вызначэнні асноўных педагагічных аспектаў пры навучанні народнай манеры спеваў з улікам рэгіянальных асаблівасцей выканання беларускай народнай песні, стварэнні і эксперыментальнай праверцы методыкі навучання, выяўленні аптымальных умоў паспяховай рэалізацыі гэтай методыкі ў навучальным працэсе. У даследаванні распрацаваны комплекс практыкаванняў, якія накіраваны на развіццё вакальных здольнасцей, падкрэслены асноўныя накірункі ў навучанні стылізаванай і акадэмізаванай манерам спеваў.

Эксперыментальны матэрыял, атрыманы ў дысертацыі, дазволіў удакладніць і пашырыць веды па вывучэнню народнапесенных традыцый Беларусі і вакальнага навучання. Веды аб рэгіянальных асаблівасцях народнай манеры спеваў дазволяць больш эфектыўна арганізаваць і планаваць навучальна-выхаваўчы працэс, будуць садзейнічаць развіццю індывідуальных здольнасцей і творчай актыўнасці студэнтаў і ўдзельнікаў фальклорных гуртоў. На падставе атрыманых даных створаны рэкамендацыі навучэнцам і практычным работнікам для больш глыбокага асэнсавання праблем вакальнай падрыхтоўкі і педагагічнай дзейнасці па авалоданню рэгіянальнай манерай спеваў і яе захаванню.




## РЕЗЮМЕ


Громович Ирина Михайловна “Педагогические аспекты обучения народной манере пения с учетом региональных песенных традиций Белоруссии”.

**Ключевые слова:** народнопесенная традиция, вокальная педагогика, народная манера пения, вокальное воспитание, бытовая манера пения, академизированная манера, региональные особенности речи, жанровое многообразие народной песни.

**Объект исследования** — процесс обучения народной манере пения в музыкальных учебных заведениях и любительских фольклорных коллективах.

**Предмет исследования** — теоретико-методические аспекты совершенствования подготовки кадров в музыкальных учебных заведениях и освоение народнопесенных традиций в любительских фольклорных коллективах.

**Цель исследования** — раскрыть основные факторы, которые влияют на народную манеру пения, разработать теоретико-методические положения в сфере обучения народной манере пения, обеспечивающие улучшение подготовки кадров.

**Основные методы:** теоретический анализ источников научной и учебно-методической литературы, изучение и анализ существующих методик вокального обучения в музыкальных учебных заведениях и любительских фольклорных коллективах, наблюдение, интервьюирование, анкетирование, педагогический эксперимент.

В результате проведенного диссертационного исследования получены показатели, новизна которых заключается в определении основных педагогических аспектов при обучении народной манере пения с учетом региональных особенностей исполнения белорусской народной песни, экспериментальной проверки методики обучения, выявления оптимальных условий успешной реализации этой методики в учебном процессе. В исследовании разработан комплекс упражнений, который направлен на развитие вокальных способностей, подчеркнуты основные направления в обучении стилизованной и академизированной манерам пения.

Экспериментальный материал, полученный в диссертации, позволил уточнить и расширить знания по изучению народнопесенных традиций Белоруссии и вокального обучения. Знания региональных особенностей народной манеры пения позволят эффективнее организовать и планировать учебно-воспитательный процесс, будут способствовать развитию индивидуальных способностей и творческой активности студентов и участников фольклорных ансамблей. На основе полученных данных созданы рекомендации студентам и практическим работникам для более глубокого осмысления проблем вокальной подготовки и педагогической деятельности по овладению региональной манерой пения и ее сохранению.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## SUMMARY

Gramovich Irina Mikhailovna "Pedagogic Aspects of the Performance Style Teaching as Regards the Belarusian Regional Song Traditions".

**Key word-combination:** folksong tradition, vocal pedagogics, folk style of singing, vocal education, everyday manner of singing, academic style of singing, regional speech peculiarities, folksong genre multiformity.

We have investigated the learning process and mastering of folk-song traditions in the musical institutions and amateur ensembles.

Our research is fulfilled for the purpose of working out theoretic and methodic directions in the sphere of teaching the Belarussian regional perfomance style, to scientifically substantiate and experimentally verify the results; in the end to determine the necessary conditions for training skilled personnel.

To achieve our object we have studied and analysed special literature on building up folklore and filling in questionnaires, carried out a pedagogic test and measured the validity of the students activities, interviewed the participants and leaders of folklore ensembles.

The results obtained manifest data the novelty of which is formed in determining major pedagogic aspects when teaching the folk-song perfomance style, while taking into consideration the Belarusian regional song manner peculiarities, the teaching methods organization and its experimental verification, the finding out of optimum conditions for a more effective realisation of these methods in the learning process. A diversity of exercises has been elaborated aimed at developing vocal aptitude, the main directions in teaching the stylized and academic manner of singing are accentuated.

The experimental dissertation data have provided us with ample opportunity to specify and expand our range of information of Belorusian folk-song traditions and vocal teaching. The knowledge of the regional peculiarities in the folk-song performance manner has made it possible to effectively organize and plan an educational teaching process, to further promote, the development of individual abilities and creative activities in the students and folklore ensembles participants.

In the final analysis a number of recommended instructions have been prerared for students and workers in the field of art. These instructions can be applied for a profound comprehension of the vocal and pedagogic problems in the mastering of a regional performance song style and its content.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аўтарэферат
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук

**ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ НАВУЧАННЯ НАРОДНАЙ МАНЕРЫ СПЕВАЎ З УЛІКАМ РЭГІЯНАЛЬНЫХ ПЕСЕННЫХ ТРАДЫЦЫЙ БЕЛАРУСІ**

Грамовіч Ірына Міхайлаўна

Падпісана ў друк 24.04 98г. Фармат 60x84 1/16.
Папера пішчая. Ум.друк.л. 128. Ум.выд.л 115.
Тыраж 80 экз. Заказ 25.

Рызограф Беларускага універсітэта культуры
220001. Мінск, вул.Рабкораўская. 1